ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ

# РАШЭННЕ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ
## “Аб зацвярджэнні Палажэння пра выбары Старшыні Выбарчай камісіі”

17 лютага 2026 года г. Варшава

У адпаведнасці з падпунктамі 4.6 і 4.9.4 пункта 4 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду, прынятага 20 студзеня 2026 года, Выбарчая камісія ў асобах Яраслава Бекіша, Алены Жылачкінай (Жываглод), Пятра Маркелава, Алены Прыходзька і Дзмітрыя Фурманава зацвярджае Палажэнне пра выбары Старшыні Выбарчай камісіі.

## ПАЛАЖЭННЕ
## пра выбары Старшыні Выбарчай камісіі

1. Старшыня Выбарчай камісіі (далей - Камісія) абіраецца сябрамі Камісіі са свайго складу таемным галасаваннем простай большасцю галасоў падчас адкрытага пасяджэння.

2. Адкрытае пасяджэнне праводзіцца пры ўдзеле ўсіх абраных Каардынацыйнай радай чальцоў Камісіі праз сістэму відэаканферэнцсувязі і суправаджаецца анлайн-трансляцыяй на YouTube-канале Каардынацыйнай рады з адкрытым доступам для ўсіх ахвочых.

3. Кандыдатуры на пасаду Старшыні Камісіі вылучаюцца адным з наступных чынаў:

3.1. праз самавылучэнне паводле адпаведнай заявы на пасяджэнні;

3.2. па прапанове чальца Камісіі і пры наяўнасці выказанай згоды асобы, якую прапануюць на вылучэнне.

4. У выпадку, калі на пасаду Старшыні Камісіі вылучана толькі адна кандыдатура, кожны чалец Камісіі можа прагаласаваць “за” ці “супраць” кандыдатуры або ўстрымацца ад галасання па адной ці некалькіх кандыдатурах. Калі вылучана большая колькасць кандыдатур, кожны чалец Камісіі мае адзін голас, які можа аддаць за адну кандыдатуру, супраць усіх або устрымацца ад галасавання.

5. Абранай на пасаду лічыцца кандыдатура, якая набрала простую большасць галасоў “за” ў першым туры галасавання. Пад простай большасцю разумееца колькасць галасоў, якая перавышае палову ад агульнай колькасці чальцоў Камісіі.

6. У выпадку, калі ў першым туры галасавання пераможца не вызначаны, праводзіцца другі тур галасавання, у якім удзельнічаюць дзве кандыдатуры, што набралі найбольшую колькасць галасоў “за”.

7. У выпадку, калі па выніках першага тура галасавання болей за дзве кандыдатуры атрымалі аднолькавую найбольшую колькасць галасоў “за”, усе такія кандыдатуры прымаюць удзел у другім туры галасавання.

8. У выпадку, калі па выніках першага тура галасавання некалькі кандыдатур дзеляць другое месца па колькасці галасоў “за”, другі тур галасавання праводзіцца з удзелам усіх такіх кандыдатур.

9. Галасаванне праводзіцца неабходную колькасць тураў да таго часу, пакуль Старшыня не будзе абраны простай большасцю галасоў.

10. У выпадку, калі вынік галасавання ў адным з тураў паўтарае вынікі дзвух папярэдніх тураў галасавання, чальцы Камісіі падчас пасяджэння выпрацоўваюць парадак далейшага правядзення галасавання.

11. Парадак правядзення галасавання, агучванне яго вынікаў забяспечвае старшыня пасяджэння.

12. Працэс галасавання ажыццяўляецца ў адмыслова створаным старшынёй пасяджэння чаце ў прыкладанні Telegram праз функцыю правядзення ананімнага апытання. Удзельнікамі чату з’яўляюцца выключна чальцы Камісіі, якія павінны праверыць сапраўднасць свайго ўдзелу ў ім. Пры наяўнасці абставінаў, звязаных з лічбавай бяспекай або ў выпадку ўзнікнення тэхнічных складанасцяў правядзення трансляцыі працэса галасавання, апошняя можа не ажыццяўляцца.

Чальцы Выбарчай Камісіі:

Яраслаў Бекіш

Алена Жылачкіна (Жываглод) Elena Zhilochkina

Пётр Маркелаў

Алена Прыходзька

Дзмітрый Фурманаў